# *РЕЦЕНЗИИ*

***Бурдзялёва І.А. Літаратура ў каардынатах часу: выбраныя працы. – Мінск: МДЛУ, 2024. – 232 с.***

Кніга Ірыны Аляксееўны Бурдзялёвай называецца «Літаратура ў каардынатах часу». Часовыя каардынаты агляду даследчыцай беларускага літаратурнага працэсу – амаль чатыры стагоддзі, з XVII ст. па XXI ст. Пазначаны вучонай і прасторавыя каардынаты: неаднаразова ў кнізе гучаць паняцці топасу, геапаэтыкі – таму што размова ідзе аб беларускай прасторы, зафіксаванай ў мастацкім слове, або аб сусветнай прасторы вачыма суайчынніка, які вымушаны «існаваць на геапалітычным скрыжаванні ва ўмовах своеасаблівага «еўрапейскага скразняку», прасторы супрацьстаяння дзвюх цывілізацыйных сістэм Захаду і Усходу» [1, с. 195]. Такім чынам, у беларускай літаратуры зафіксаваны вобраз свету ад Сібіры да Турэччыны, ад сталічнага жыцця да быту шляхецкай або мяшчанскай сядзібы. Кнігу Ірыны Бурдзялёвай можна лічыць новым падарожжам па заблытаных шляхах беларускага літаратурнага «лесу», дзе існуюць кнігі як на польскай, так і на беларускай мовах, кнігі розных стылёвых варункаў і жанравых пазначэнняў.

Дасведчаны праваднік – дацэнт, кандыдат філалагічных навук І.А. Бурдзялёва, выкладчык Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта прапанавала вынікі свайго шматгадовага вывучэння беларускай літаратуры. Кніга будуецца з дваццаці трох артыкулаў, структурна аб'яднанных па трох раздзелах адпаведна часоваму падзелу гісторыі літаратуры: новая беларуская літаратура XVII – пачатку XIX стст.; станаўленне беларускай літаратуры ў XIX – пачатку XX стст.; класічны і посткласічны перыяд развіцця беларускай літаратуры ў XX – пачатку XXI стст. Але ўсе тэксты маюць адзін бок бачання – з пункту гледжання сучаснасці. Аўтар смела інтэрпрэтуе мастацкія вобразы, надае свайму аналізу стэрэафанічнасць параўнаннямі. Напрыклад, сваю прэзентацыю «новай беларускай літаратуры» І. Бурдзялёва пачынае з артыкула, прысвечанага кнізе ўспамінаў С. Пільштынавай-Русецкай: авантурны характар гэтага твора дае магчымасць даследчыцы правесці паралель з жанравымі варыянтамі пікарэскі сусветнай літаратуры ад Менандра да Ф. Рабле, іх нацыянальных літаратурных варыянтаў, у тым ліку і найбольш яскравых пікарэсных герояў у беларускай літаратуры – у творах У. Караткевіча [1, с. 9]. Як бачым, межы аналізу «Авантураў» С. Пільштынавай-Русецкай пашыраюцца да XX ст. і ўдала спрыяюць разуменню значнасці і ролі ў развіцці ў беларускай літаратуры гістарычнага твору.

Важная рыса кнігі Ірыны Бурдзялёвай – наданне шматабліччу беларускай літаратуры пэўных стылёвых характарыстык, вызначэнне каранёў ці матываў паходжання тых ці іншых вобразных сістэм. У межах даследавання літаратуры XVIII ст. аўтарка сцвярджае, што «новая беларуская літаратура» нараджаецца не на антычным падмурку, а на сваіх фальклорных здабытках [1, с. 17]. А рамантычнае светаадчуванне нацыянальнай літаратуры пачатку XIX ст. нараджаецца ў духоўнай спадчыне французскага русаісцкага сентыменталізму з яго культам прыроды і «супрацьстаяннем асобы дэструктыўнай цывілізацыі і поўнаму фальшывых каштоўнасцей грамадству» [1, с. 19], прыкладам чаго становіцца, на думку аўтара, «юнгізм Ф. Карпінскага і І. Іваноўскага, асаянізм Ф. Княжніна і Ю.У. Нямцэвіча» [1, с. 17] і маралізатарства гатычнай прозы Г.А. Мастоўскай. Але ў атмасферы ўплываў літаратур розных еўрапейскіх народаў айчынныя пісьменнікі імкнуліся да гістарычнага адлюстравання «дахрысціянскай Славяншчыны» ці рэчпаспалітаўскага жыцця. Сярод чужых літаратурных стылістычных варункаў выспяваў культ Беларушчыны.

Менавіта ў полістылістычным асветніцкім стагоддзі нараджаецца і галоўны канцэпт беларускай літаратуры – шляхецкі сядзібны топас. Тут жывуць разам, спрачаючца паміж сабой і кансерватыўныя ідэолагі сарматызму, і шляхцічы-хрысціяне са шчырай верай у Бога і Радзіму. Рэфарматарская дзейнасць мясцовых асветнікаў і класічныя літаратурныя фантазіі наконт справядлівай будучыні становяцца асновай для стварэння «сядзібнай утопіі», ідэалізаванай «міні-краіны» з выгляду, напрыклад, маёнтка Кларан з «Пана Падстоліца» Э.Т. Масальскага. Але паступова ў літаратурных творах пісьменнікаў наступных часоў гэты топас гіне. Мастакі слова апісваюць гэты працэс паэтычна, праз міфалагему «згубленага Эдэму», у характве якога «патэнцыяльна закладзена спакуса грэхападзення і яго страты ў выніку праяўленай волі чалавека» [1, с. 182]: ад паэмы Я. Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» [1, с. 215], праз эпічнае палатно І. Мележа «Палескай хронікі» да рамана В. Казько «Неруш» пра сацыяльную і цывілізацыйную катастрофу палесскага краю.

У новай кнізе глыбока прааналізаваны барочныя (пікарэсныя), перадрамантычныя (сентыменталістычныя) варункі нацыянальнай літаратуры. Багацце жанравых пошукаў, народжаных асветніцкімі ідэямі, таксама становіцца полем даследавання І. Бурдзялёвай. Пікарэсны, гатычны, дыдактычны, адміністратыўны, натуралістычны, філасофскі раманы, утопія і крымінальная проза – гэтыя вызначэнні не аднойчы можна сустрэць на старонках выдання.

Значнае месца ў кнізе адведзена эга-літаратуры: эпісталярыю і дзённіку-травелог А. Скірмунт («З жыцця літвінкі»), мемуарам А. Пакаш, «У Вільні і ў літоўскіх маёнтках» Г. Пузыні, «Успамінам з жыцця» Е. Фялінскай, «Успамінам» А.Э. Адынца, «Скарбам жыцця» М. Гарэцкага і інш. Распаўсюджанасць такога кірунку ў айчынным літаратурным працэсе спрыяе распрацоўцы не толькі тэмы паўсюдзённасці, ад бідэрмайерызму і натуралізму, з іх фіксацыяй побыту, этнаграфічных і гістарычных падрабязнасцей, але і нараджае асаблівы сплаў эпічнасці і лірычнасці: «Індывідуальнасць і суб'ектыўнасць мемуарнага твора родніць яго з лірычнымі жанрамі, ліра-эпічнай паэзіяй» [1, с. 127]. Эга-літаратура ў сваёй сукупнасці стварае шматгалоссе думак, пачуццяў, ідэй – лірызм ці

суб'ектыўнасць апавядання існуюць побач з дыскусійнасцю, спаборніцтвам. Тут дарэчна будзе ўзгадаць вызначэнне А. Адамовічам дакументальнай літаратуры як аркестра, у якім кожны голас-інструмент важкі для стварэння канцэрта-твора, словамі Ірыны Бурдзялёвай, гэтае вызначэнне можа гучаць такім чынам: «Дзякуючы спалучэнню такіх жанрава-родавых рыс, як рэтраспектыўнасць і памяць, эгадакументы дапамагаюць выявіць канкрэтныя формы быцця і спосабы мыслення розных сацыяльных груп грамадства» [1, с. 104].

Айчынная мемуарыстыка прадстаўлена ў кнізе І. Бурдзелёвай як дакументальна-вобразная структура, дзе суб'ектыўна аўтары даносяць да будучага чытача канкрэтную гістарычную інфармацыю, пры гэтым ствараюць унутры тэкста зварот да адрасанта-аднадумца – А.Э. Адынец робіць гэта нават праз фармальны зварот да сяброўкі (сястрычкі) – прадстаўніка другога, наступнага пакаленны айчынных літаратараў [1, с. 121].

Ірына Бурдзялёва ўводзіць у беларускі нацыянальны літаратурны кантэкст шэраг некласічных тэкстаў, якія ў свой час займалі нішу трывіяльнай ці масавай літаратуры, або былі абмежаваны сямейнымі ці групавымі інтарэсамі (мемуарная літаратура), а сёння выклікаюць спрэчкі паміж гісторыкамі. Даследчыца аналізуе той комплекс літаратуры, які, звычайна, стварае фон нацыянальнаму літаратурнаму працэсу. Палова раманаў, напрыклад, польскамоўнага пісьменніка і журналіста першай паловы ХХ ст. Т. Даленгі-Мастовіча экранізавана, бо маюць выразную сцэнарную гісторыю ў сваёй меладраматычнай аснове (гісторыя прафесара-знахара набыла экранны выгляд ужо тройчы) і з'яўляюцца эталонам масавай літаратуры. А дзённікі, успаміны такіх пісьменнікаў і ўдзельнікаў філаматаўскага руху, як Е. Фялінская і А.Э. Адынец дайшлі да суайчыннікаў праз пэўны час і высвятляюць невядомыя старонкі жыцця, ствараюць вакол сябе навуковы элітарны дыскурс.

Праз усю кнігу праходзіць тэзіс пра правакацыйнасць беларускай літаратуры. У разуменні даследчыцы, гэтая якасць прыгожага пісьменства – ёсць умова руху, хуткага засвойвання новых стыляў і напрамкаў пісьменства, гэта прэзентуецца ў дыялагічнасці еўрапейскай і нацыянальнай, класічнай і посткласічнай традыцый. Я. Купала правакуе паўторамі паэтычнай заявы «бо я мужык» старэйшае пакаленне паэтаў і польска-расейскую адукаваную літаратурную інтэлегенцыю [1, с. 130–136]. А пісьменніца пачатку ХХІ ст. Е. Вежнавец ужо ўступае ў дыскусію з самім Купалам, ствараючы ў аповесці «Па што ідеш, воўча?» «адасоблены ад свету замкнённы кут» беларускага паселішча «над ракой Арэсай» і разбураючы «міф пра беларускую талерантнасць» [1, с. 213].

У мастацкай палеміцы знаходзяцца і польскамоўныя пісьменнікі першай паловы ХХ ст. Т. Даленга-Мастовіч і С. Пясецкі, бо ў іх творах па-рознаму прадстаўлена Беларушчына: як ідэалізаванае месца з традыцыйнымі хрысціянскімі каштоўнасцямі недзе на Віцебшчыне і як памежжа, францір, дзе выжыць магчыма не ўсім авантурыстам [1, с. 163–170]. Дыялог культурных традыцый – галоўная тэма кнігі. Даследчыца прыходзіць да высновы, што айчынная прастора паміж вялікімі дзяржаўнымі літаратурамі паспрыяла да ўзмоцненнага палемічнага ці правакацыйнага яе характару, «наяўнасці ў нацыянальнай літаратуры на працягу ўсяго яе шляху канцэптуальна рознаскіраваных тэндэнцый і з'яў» [1, с. 215]. Крытыка свайго яскрава бачна праз розныя погляды на сядзібны топас ці топас беларускага мястэчка.

Яшчэ адна агульная характарыстыка нацыянальнай літаратуры – яе экзістэнцыйная праблематыка, што ўвасабляецца ў апісанні сітуацый «катастрофы, крызісу, разбурэння, смерці; у даследаванні атрыбутыўных з'яў, характэрных для паэтыкі экзістэнцыялізму, – свабоды, адзіноты, адчужанасці, сутыкнення нацыянальнага і ірацыянальнага» [1, с. 195]. І тут яскравым прыкладам могуць быць артыкулы пра апошнія творы М. Гарэцкага (Тастамент Гарэцкага) або некалькі артыкулаў пра творчасць В. Казько. В. Казько прадстаўлены даследчыцай як пісьменнік-мартыст [1, с. 198], бо смерць становіцца галоўнай гераіняй яго апошніх твораў (аповесцяў зборніка «Час збіраць косці»). Матыў смерці ці болю, што ёсць «неад'емны кампанент жыцця ў абсурдным і няўтульным свеце» [1, с. 204] выяўлены крытыкам і ў аповесцях Б. Пятровіча «Стах» і «Пуціна».

ЛІТАРАТУРА

1. Бурдзялёва І.А. Літаратура ў каардынатах часу: выбраныя працы. – Мінск: МДЛУ, 2024. – 232 с.

***Канд. філал. навук, дац., Н.Б. ЛЫСОВА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***